# Критика, библиография

# Critics, bibliography

**Критика в контексте современной культуры : коллективная монография** / отв. ред. А. П. Короченский, Л. П. Саенкова-Мельницкая. Белгород : Эпицентр, 2020. 144 с.

**Крытыка ў кантэксце сучаснай культуры : калектыўная манаграфія** / адк. рэд. А. П. Карочанскі, Л. П. Саянкова-Мельніцкая. Белгарад : Эпіцэнтр, 2020. 144 с.

**Criticism in the context of contemporary culture : collective monograph** / ed. by A. P. Korochensky, L. P. Sayenkova-Melnitskaya. Belgorod: Epicenter, 2020. 144 p.

Літаратурна-мастацкая крытыка, якая стала прадметам даследавання ў калектыўнай манаграфіі беларускіх і рускіх навукоўцаў, з'яўляючыся разнавіднасцю публіцыстыкі, сёння выступае як значная сацыяльна-грамадская з'ява, што ў пэўнай ступені фарміруе свядомасць сучасніка і ўздзейнічае на яе. Літаратурна-мастацкая крытыка непасрэдным чынам звязана з палітыкай, мараллю, сацыялогіяй, псіхалогіяй, філасофіяй – з усім тым, што складае духоўны свет чалавека. І ўсё ж сучасныя даследчыкі сцвярджаюць, што вызначальным яе пачаткам з'яўляецца ідэалагічны ўзровень. У свой час прэса стварыла крытыку, не дзіўна, што друкаваныя СМІ, разлічаныя на шырокага чытача, маюць свае патрабаванні да аўтараў літаратурна-мастацкіх матэрыялаў. Найважнейнымі з іх выступаюць спалучанасць з надзённай грамадскай праблематыкай, уменне бачыць маральна-этычныя арыенціры мастацтва, здольнасць вызначыць глыбінную сутнасць мастацкай з'явы і данесці яе да аўдыторыі. Крытыка інфармуе пра новыя творы, аўтараў ці пра мастацкія з'явы і, ацэньваючы іх, пэўным чынам падаючы інфармацыю, выпрацоўвае тое ці іншае стаўленне аўдыторыі да іх.

Калектыўная манаграфія «Крытыка ў кантэксце сучаснай культуры», створаная міжнародным калектывам даследчыкаў, аналізуе стан сучаснай крытыкі ў розных сферах культуры (літаратуры, музыцы, кіно, выяўленчым і тэатральным мастацтвах), а таксама не пакідае па-за ўвагай і такую з'яву сучаснай культуры, як медыякрытыка. У прадмове да кнігі доктар філалагічных навук, прафесар Белгародскага дзяржаўнага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта А. П. Карочанскі звяртае ўвагу на пашырэнне медыятызацыі ў сучасным свеце і звязаную з гэтым неабходнасць крытыкі ўлічваць гэты факт, выкарыстоўваючы ўсе магчымыя медыйныя каналы для выхаду на шырокую аўдыторыю. Адзначаючы з'яўленне ў інтэрнэт-прасторы так званай непрафесійнай (грамадзянскай, спажывецкай, аматарскай і г. д.) крытыкі, навуковец заклікае не адмаўляць яе агулам, а ўспрымаць яе лепшыя ўзоры як праяву сучаснага культурнага дыскурсу.

Несумненна, чытацкай увагі заслугоўвае і раздзел «Журналісцкая медыякрытыка», напісаны А. П. Карочанскім, дзе вызначаны сутнасць і змест журналісцкай крытыкі СМІ, што, паводле даследчыка, «уяўляе сабой зносіны з аўдыторыяй, у працэсе якіх на аснове аналізу, інтэрпрэтацыі і ацэнкі медыятэксту, жанрава-стылявых форм яго ўвасаблення аказваецца ўплыў на ўспрыманне медыйнага зместу публікацый, на ўяўленні аб матэрыяльным і духоўным свеце, што фарміруюцца ў свядомасці атрымальнікаў масавай інфармацыі»[1] (с. 123). Вучоны лічыць, што медыякрытыка, валодаючы спецыфічнай карэкцыйнай функцыяй, здольна змяняць успрыманне аўдыторыяй медыйнага кантэнту, які распаўсюджваецца вядучымі СМІ, фарміраваць усвядомленае крытычнае стаўленне да яго, уплываць на медыяспажыванне і медыйную практыку, развіваючы медыякампетэнтнасць публікі.

Тэарэтычныя пытанні развіцця сучаснай кінакрытыкі разглядаюцца загадчыцай кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Беларускага дзяржаўнага

[1] Тут і далей пераклад наш. – *Г. Т.*


CC BY NC

ўніверсітэта Л. П. Саянковай-Мельніцкай у радзеле «Эвалюцыя кінакрытыкі ў кантэксце журналістыкі». Прасочваючы станаўленне і эвалюцыю кінакрытыкі ад часоў яе ўзнікнення і да сучаснасці, даследчыца адзначае, што «спажывецкія запыты змянілі жанравую палітру, аўтарскія акцэнты, увесь крытычны інструментар прадстаўлення фільма ў прэсе» (с. 85). У выніку аналізу канкрэтнага медыякантэнту Л. П. Саянкова-Мельніцкая прыходзіць да несуцяшальнай высновы: сучасная крытыка «стала часткай рэкламнай кампаніі, якая з'яўляецца натуральным элементам у ланцугу вытворча-таварных адносін» (с. 85).

Тым не менш існуюць і станоўчыя тэндэнцыі павышэння цікавасці масавай аўдыторыі да выяўленчага мастацтва. У многім гэта тлумачыцца, па меркаванні дацэнта Г. Б. Багданавай (аўтара раздзела «Ключ да ўспрымання вобразаў. Выяўленчае мастацтва ў люстэрку мастацкай крытыкі»), імкненнем сучаснага чалавека да засваення візуальнай інфармацыі. Наведвальнікі мастацкіх выстаў, галерэй і музеяў параўноўваць сваё ўспрыманне арт-аб'екта з успрыманнем і ацэнкай спецыяліста, мастацтвазнаўцы, крытыка, таго, хто дапаможа знайсці ключ да разумення вобразаў. Аналізуючы стан сучаснай арт-крытыкі, прадстаўленай у медыяпрасторы Беларусі, даследчыца спыняецца на актуальных праблемах і здабытках айчыннай арт-журналістыкі.

Пра музычную крытыку ў сучаснай медыйнай рэпрэзентацыі разважае кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык аддзела экранных мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А. А. Карпілава. Не засталася па-за ўвагай у выданні і тэатральная крытыка нашага часу. Доктар філалагічных навук, прафесар Т. Д. Арлова прыходзіць да высновы, што ў сучасным тэатры Беларусі вызначыліся дзве тэндэнцыі развіцця. Адна з іх звязана з непазбежнымі пошукамі новай сцэнічнай мовы, а другая «спрабуе канкурыраваць з шоу-бізнесам і вольна ці міжволі прапагандуе поп-культуру» (с. 28). У манаграфіі таксама ідзе гаворка і пра месца літаратурнай крытыкі ў сучаснай медыяпрасторы. Кандыдат філалагічных навук І. Л. Шаўлякова-Барзенка звяртае ўвагу на неабходнасць вывучэння індывідуальна-аўтарскіх стратэгій як структураўтваральных кампанентаў сучаснага літаратурна-крытычнага дыскурсу.

Такім чынам, структура манаграфіі адлюстроўвае наяўнасць розных напрамкаў у журналісцка-крытычнай дзейнасці. Прызначаная як для студэнтаў, так і для журналістаў-практыкаў, што спецыялізуюцца на асвятленні культурнай праблематыкі, кніга знаёміць чытача з гісторыяй і сучасным станам арт-журналістыкі ў Расіі і Беларусі.

***Г. К. Тычко***[2]

[2]*Галина Казимировна Тычко* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики Белорусского государственного университета.
*Galina K. Tychko*, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism, Belarusian State University.
E-mail: *tychko@mail.ru*